**Даўматовіч К.Д.**

# “АПАВЯДАННЕ АБ ЗГУБЕ ТЭСТАМЕНТА НЯБОЖЧЫКА ПАНА ДЗМІТРЫЯ ЯНАВІЧА САПЕГІ І ІНШЫХ ЛІСТОЎ” ЯК КРЫНІЦА ПА ГІСТОРЫІ ГАРАДЗЕНСКАГА СОЙМА 1568 ГОДА

*Ключавыя словы: Вялікае Княства Літоўскае, сойм, парламентарызм, актавая кніга земскага суда, гістарычная крыніца, Сапегі, археаграфія.*

У вывучэнні гісторыі сойма Вялікага Княства Літоўскага (далей – ВКЛ) навукоўцы ў канцы ХІХ – першай чвэрці ХХІ ст. значную ўвагу надавалі Метрыцы ВКЛ. Гэта крыніца ўключае featureрознабаковыя тыпы дакументаў ў тым ліку і тыя, якія адносяцца да гісторыі парламентарызму (асобныя лісты, соймавыя лісты і іх рэестры, просьбы–адказы падчас паседжанняў і шмат інш.). Але ў гістарыяграфіі на дадзены момант не ў поўнай меры выкарыстаны інфармацыйны патэнцыял іншых тыпаў крыніц [1–4; 7 і інш.]. У гэтым сэнсе унікальнымі крыніцамі з’яўляюцца актавыя кнігі земскіх судоў, якія таксама дазваляюць рэканструяваць гісторыю сойма ВКЛ.

Шэраг актавых кніг земскіх судоў ВКЛ на дадзены момант захоўваюцца ў розных архівасховішчах краін Цэнтральнай і Усходняй Еўропы. Вялікую цікавасць выклікаюць актавыя кнігі, якія знаходзяцца ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі. Так, напрыклад, у кнізе Берасцейскага земскага суда змяшчаецца комплекс дакументаў, якія адносяцца да берасцейскага сойма 1566 г. [5, арк. 16–16 адв.] і гарадзенскага сойма 1566–1567 гг. [5, арк. 20–42 адв., 45 адв. – 72 адв., 74–87 адв.]. Акрамя гэтага, цікавасць выклікала кніга Гарадзенскага земскага суда, у якой таксама ёсць дакументы па гісторыі парламентарызму ВКЛ [6, арк. 259]. Дадзеныя крыніцы дазваляюць прасачыць уплыў дзейнасці сойма не толькі на агульнадзяржаўным узроўні, але і на лакальным.

У актавай кнізе Гарадзенскага земскага суда трэба адзначыць “Апавяданне пана Мікалая Міхайлавіча Сапегі аб згубе тэстамента нябожчыка пана Дзмітрыя Янавіча Сапегі, дзядзькі яго, і іншых лістоў”. Гэты дакумент можам разглядаць як крыніцу па гісторыі сойму 1568 г. у Гародні, які вырашаў агульнадзяржаўныя (арганізацыя фінансаў і войска, унія з Польшчай і інш.) і лакальныя пытанні ВКЛ [3, с. 790–815; 7, с. 436–518].

Так, у 1570 г. Мікалай Міхайлавіч Сапега звярнуўся ў Гарадзенскі земскі суд са скаргай на слугу Лаўрыша Пякоўскага, які згубіў торбу з тэстаментам Дзмітрыя Янавіча Сапегі, квітамі Станіслава Дзержаноўскага і Петра Пекаслаўскага, а таксама іншыя патрэбныя лісты. У дакуменце адзначана, што гэты тэстамент Дзмітрый Янавіч Сапега пакінуў у манарха праз шэсць тыдняў пасля заканчэння гарадзенскага сойма ў 1568 г. Такім чынам, заканчэнне паседжання сойма стала храналагічным арыенцірам для ісца [6, арк. 259]. Варта падкрэсліць, што дадзены дакумент можа выкарыстоўвацца і ў межах іншых навуковых праблем.

Ніжэй публікуецца дакумент “Апавяданне пана Мікалая Міхайлавіча Сапегі аб згубе тэстамента нябожчыка пана Дзмітрыя Янавіча Сапегі, дзядзькі яго, і іншых лістоў”, які знаходзіца ў актавай кнізе Гарадзенскага земскага суда Нацыяльнага гістарычнага архіва Беларусі (Ф. 1755. Воп. 1. Спр. 4. Арк. 259):

wПОВЕДА*Н*Е П(А)НА МИКОЛАЯ МИХА(И)ЛОВИЧА СОПѢГИ w *З*ГУ|бе тестаме*н*ту небо*ж*чика п(а)на Дмитра Яновича | Сопѣги, дѧ*д*ка его, и и*н*шихъ листовъ |

Того*ж* днѧ в понеделок |

Прише*д*ши до судɣ,[1] пере*д* мене Ивана Федоровича Ма|са*л*ского су*д*ью а Василья Михаловича Меле*ш*ка под|су*д*ка вра*д*никовъ, земски*х* городе*н*ски*х*, дворани г(оспо)д(а)рьски | па*н* Микола

[1] Коска ў рукапісе.

Миха*и*лович[1] Сопега[2]. ѡповедалъ тыми | словы: и*ж*(ъ) де*и* с пѧтницы на суботу в ночи месеца се*н*|тѧбра два*д*цать девѧтого днѧ едꙋчи мне спо|лэмъ с паномъ Федоромъ Ку*н*цевичо*м*, хоружимъ горо|де*н*скимъ, з ыме*ня* его м(и)л(о)*с*ти Тужевичъ до места | г(оспо)д(а)рьско*г*(о) городе*н*ского, слуга мо*г* именем Лавры*ш* Пеко*в*|ски згуби*л* то*р*бу реме*н*ную, в которо*и* было два звѧз|ки листо*в* мне потребны*х* а меновите: теста|ме*нт* дѧ*д*ька мое*г*(о) небощика п(а)на Дмитра Яновича | Сопеги[3], которы тестаме*нт* менилъ иж(ъ) де*и* на рокохъ | судовы*х* в рокꙋ ше*ст*десѧтъ ѡсмомъ ѡ*т* королѧ е*г*(о) м(и)л(о)*с*ти | в шести неделѧхъ по се*и*ме ва*л*номъ городе(н)скомъ[4]. | ѡ средо постью зложоны*х* ѡповеда*в*ши записа сва*р* | п(а)на Федора Ку*н*цевича, меновите слово в слово до кни*г* | земскихъ вписати да*л* та*к*же де*и* на то*т* же час.[5] | В то*р*бе згину*л* кви*т* ѡ*т* Станислава Де*р*жановск*г*о на | се*м*десѧтъ золоты*х* по*л*скихъ, а дрꙋги кви*т* Пе*т*ра Пеко|сла*в*ского на два*д*цать,[6] и пѧ*т* золотыхъ польскихъ | и и*н*ши*х* листовъ потребны*х*, которыхъ на то*т* часъ | меновать и поменe*ть* не могу. Которое ѡповеда*н*е до | кни*г* земски*х* городе*н*скихъ записано есть. |

Такім чынам, “Апавяданне аб згубе тэстамента нябожчыка пана Дзмітрыя Янавіча Сапегі і іншых лістоў” можа выкарыстоўвацца як крыцніца па гісторыі гарадзенскага сойма 1568 г. Дадзены дакумент паказвае важнасць соймавага паседжання як храналагічнага арыенціра падчас судовага разбіральніцтва 1570 г. у Гарадзенскім земскім судзе. Акрамя гэтага, публікуемую крыніцу можна разглядаць у межах праблем генеалогіі і дзейнасці рода Сапег, функцыянавання і складу Гарадзенскага земскага суда, а таксама гісторыі паўсядзённасці ВКЛ.

1. Довматович, К. Д. Сейм Великого Княжества Литовского в историографии Восточной Европы конца XIX – первой половины XX в. / К. Д. Довматович // Научные труды Республиканского института высшей школы. Исторические и психолого-педагогические науки : сб. науч. статей. – Минск : РИВШ, 2023. – Вып. 23, ч. 1 : Исторические науки. – С. 48–56.

2. Документы Московского архива Министерства юстиции. Т. 1 / подготовил М. Довнар-Запольский. – М. : Товарищество тип. А. И. Мамонтова, 1897. – 569 с.

3. Любавский, М. К. Литовско-русский сейм. Опыт по истории учреждения в связи с внутренним строем и внешнею жизнью государства / М. К. Любавский. – М. : Московский Университет, 1900. – 1160 с.

4. Максимейко, Н. А. Сеймы Литовско-русского государства до Люблинской унии 1569 г. / Н. А. Максимейко. – Харьков : Тип. Адольфа Дарре, 1902. – 205 с.

5. Нацыяльны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 1741. Воп. 1. Спр. 61.

6. НГАБ. – Ф. 1755. Воп. 1. Спр. 4.

7. Русская историческая библиотека : в XXXIX томах / Археографическая комиссия ; И. Лаппо. – Юрьев : Тип. К. Маттисена, 1872–1927. – Т. XXX. – 1914. – 896 с.

**Рудаковская Е.Н.**

## ИСТОЧНИКИ ПО ТОПОГРАФИИ, АРХИТЕКТУРЕ И ИСТОРИИ ДРЕВНЕЙШИХ ПРАВОСЛАВНЫХ ХРАМОВ ГРОДНО XII–XVI вв.

*Ключевые слова: источники, древнейшие храмы Гродно, топография, история и архитектура средневековых церквей, картографические источники.*

Город Гродно представляет большой интерес с точки зрения культурно-просветительского туризма. В его рамках можно выделить и познавательную, и ностальгическую и даже религиозную составляющие, связанные с христианскими храмами, обителями и другими центрами Православия. В историко-культурном контексте эти святыни всегда развивались как средоточие духовной жизни общества. И изначально имели особенное, в т.ч. географическое, значение в формировании

[1] Падкрэслена ў рукапісе.
[2] Падкрэслена ў рукапісе.
[3] Падкрэслена ў рукапісе.
[4] Відаць літара “Н” была прапушчана падчас напісання дакумента ў кнігу.
[5] Кропка ў рукапісе.
[6] Коска ў рукапісе.